Уладзімір Сьцяпан



...ён застаўся адзін,
і жыцьцё страціла сэнс...

# Цені анёлаў

***Навэлы***

## ЧЫРВОНЫ МЯЧЫК

*У 1973 годдзе я паступіў
у менскую мастацкую
вучэльню імя Глебава.*

Чацьвёра хлопцаў гулялі на школьнай пляцоўцы ў футбол.

Ім было па сямнаццаць.

Яны ляніва, адно каб змарнаваць час, перакідалі мячык адзін аднаму, лупілі ў сьцяну, штурхаліся, крыху вадзілі. Адзінаму гледачу і гаспадару чырвонага мячыка было восем. Ён сядзеў на мулкай парэнчыне зламанай лавы, сьлініў далоні, прыгладжваў віхры і сачыў за палётамі свайго мячыка. Калі той адлятаў у кусты пад плот, ці пад дрэвы, то маламу даводзілася бегчы. Хлопцы не прысьпешвалі, цярпліва чакалі. Яны сноўдалі па пляцоўцы, уздымалі цёплы пыл, але ўсё гэта адбывалася нявесела, і неяк нярвова...

Мячык адкаціўся далёка, пад вокны жоўтай аднапавярховай школы, і Сярожка пайшоў, а потым пабег.

Фэд паглядзеў на гадзіньнік, толькі ён адзіны з чатырох і меў яго, і пачаў перабэрсваць чаравікі. Калі Сярожка вярнуўся, то старэйшыя сыходзілі. Мішка – Фэдаў сусед па пад’езьдзе, азірнуўся і паказаў малому кулак. Хлопцы падаліся ў бок Першамайскай, праз парк.

Сярожка, з чырвоным гумавым мячыкам у руках, пастаяў на краі пыльнай асфальтаванай пляцоўкі, падумаў і рушыў сьледам. Гуляць гэтым летнім вечарам у футбол не выпадала.

Аліка перанялі ў парку, за гаражамі. Ён ішоў, рукі ў кішэнях, глядзеў пад ногі. Пад пахай нёс палатняную торбачку з парожнім паўлітровым слоікам. Алік падняў вочы, паглядзеў кожнаму з хлопцаў у твар, выцягнуў рукі з кішэняў і адкінуў торбачку пад сьцяну. Яна мякка гупнулася на пыльную траву. Ён і не зьбіраўся ўцякаць. Не такім быў. Зубы сьцяў, напяўся, а пальцы самі ў кулакі сьцiснуліся. Ён яшчэ сьлінай, імгненна загуслай, цвыркнуў сабе пад ногі. Тут усё і пачалося. Чацьвёра на аднога, гэта “ня раз на раз”... Аліка зьбівалі з ног, валілі, а ён уставаў. Глядзеў шалёнымі вачамі на Фэда, на Мішку і кідаўся наперад. Ён не сказаў ні слова. Не папрасіў, каб яны спыніліся. Не прашаптаў кароткае “Хопіць”. Ён падцягваў ногі, станавіўся перш на каленцы, а потым на локці, і падымаўся. У Фэда пачалася сапраўдная істэрыка. Фэд, можа адзіны з чатырох, ведаў, што Алік – баец... Але ж не на столькі... Каб Алік ляжаў, то яго б і кінулі біць. Можа нават і падняцца дапамаглі, і да дому давялі. “Заб’ю, падла!” – закрычаў Фэд і адставіў за сьпіну руку. У далонь лёг нож. Гэта быў апошні аргумент у спрэчцы, хто, як цяпер кажуць – “круцейшы”. Пабітыя ў кроў пальцы сьціснуліся. Алік прыўзьняўся і ўбачыў белае лязо. Страсянуў разьбітай галавой, неверагодна, але здолеў зноў падняцца і рушыць насустрач нажу. Сам пайшоў на Фэда. Той зрабіў крок назад, адступіў. Зноў, але гэтым разам ня крыкнуў, а шэптам выцiснуў з сябе, паабяцаў, што заб’е. “Падай!” – спалохана крыкнуў Мішка,– “Падай, паўдурак, а то заб’е!”

Фэд не хацеў, але не было ў яго іншага выйсьця, як ня меў яго і Алік.

Крок, і нож увайшоў у жывот. Гэта была перамога.

З гэтага моманту пачынаецца іншая гісторыя.

Новая вішнёва-бліскучая “Ява” выглядала нечым нетутэйшым побач з бруднай і дабітай машынай “хуткай дапамогі”. На дзьверках аўтамабіля яркімі плямамі гарэлі адно крыжы. Віктар – гаспадар матацыкла, барабаніў пальцамі па тугім скураным сядзеньні, разглядаў пратэктары на ўскінутым пярэднім коле. Тамара стаяла побач, пад каштанам. Твар і шыя дзевятнаццацігадовай дзяўчыны пабраліся ружовымі плямамі. Тамара пра гэта ведала, але што зробіш, калі хвалявалася – скрозь чырванела. Яна толькі верхні гузік белага халата зашпіліла. “...а мне што рабіць, скажы, скажы? – выкрыквала дзяўчына. – Мне што, задавіцца цяпер? Што ты маўчыш?” “Трэба было думаць... Ты ж медык... Я тут пры чым?” – адказаў Віктар і крутануў нагой пярэдняе кола свайго новага матацыкла. Зазіхцелі срэбрам пруткі. Тамара і Віктар маўчалі. Віктару хацелася, як мага хутчэй зьехаць з абрыдлага бальнічнага двара. Тамары хацелася праваліцца скрозь зямлю. Зьнікнуць назаўсёды. Зьбег-

чы, зьехаць. Далёка-далёка, туды, дзе яе ніхто ня ведае... “Я цябе не люблю... Чуеш?” – гучна, па-будзёнаму сказаў Віктар і хутка надзеў чырвоны, пад колер “Явы”, шалом. Рухавік ня здрадзіў, завёўся з першага разу. Тамара адвярнулася і моцна заплюшчыла вочы. Так, што аж у вушах зазьвінела. А калі адкрыла, то ўбачыла толькі сіні дымок...

Сярожка хаваўся побач з гаражамі. Ён сядзеў на кукішках за кустамі барбарысу. Яго ня бачылі. Спачатку яму было цікава глядзець, як “малоцяцца” дарослыя хлопцы. Ні хто ж ні ў каго нічога не забраў. Чаму яны тады б’юцца? А потым спалохаўся, але ні закрычаць, ні пабегчы ня мог. Адно прыціскаў да жывата свой чырвоны мячык. Шкроб пазногцямі пругкую гуму, як не прапароў.

У жываце зрабілася кепска – круціла, таму і ціскаў свой мячык. Ён усё бачыў, але ня ўсё разумеў. Па-сапраўднаму спалохаўся, калі Фэд, а за ім астатнія, пабеглі. Алік ляжаў тварам у зямлю. Нерухомы. Мячык выпаў. Сярожка нахіліўся і падняў яго. Ціхенька пралез праз кусты і наблізіўся. Прамовіў імя, агледзеўся. Крануў Аліка за плячо і пабег. Ён ляцеў праз парк на плошчу. Бег і плакаў. Выскачыў праз дзірку ў агароджы. Убачыў людзей. Два мужчыны і жанчына ішлі да сталоўкі. Сярожка закрычаў, ускінуў руку. Чырвоны мячык высьлізнуў, заскакаў па дарозе, пакаціўся. Сярожка імгненьне толькі і разважаў. А потым пабег па свой мячык.

Адкуль вылецеў бліскучы матацыкал?

Ну хто скажа адкуль і навошта?

Сярожку падкінула. Спачатку ў гару, да неба, а потым ён пакаціўся па шурпатым асфальце... Ад плошчы да новай бальніцы зусім недалёка. Чырвоная кропля мячыка аддалялася, рабілася меншай, а малы цягнуў да яе рукі, пакуль кропля ня зьнікла зусім...

Тамара сядзела на цагляным ганку і плакала. Чорныя сьлёзы цяклі па шчаках. Падфарбаваныя, скусаныя вусны крывіліся.

Алік расплюшчыў вочы. Кашуля была мокрая ад крыві, крысо пінжака набрыняла, хоць выкручвай, а бок выдаваў сьлізкім. Ярка-чырвоныя далоні, быццам у алейную фарбу вымазаўся, ня слухаліся, пальцы склейваліся. Алік прыціснуў рукі да жывата. У сярэдзіне нясьцерпна пякло, і кроў з жывата цякла. Ён указальным пальцам, праз кашулю, намацаў мокрую дзірку. Побач з торбачкай, кінутай у траву, адшукаў шырокі ліст трыпутніку. Заляпіў ім дзірку, прыціснуў далоньню. Ён пайшоў праз парк да бальніцы. Праз кусты, па клумбах, напрасткі. Галоўнае не спыняцца. Да бальніцы ж недалёка. Ён дайшоў. Дацягнуўся. Давалокся. Дапоўз. У прыёмным пакоі сам скінуў пінжак, яшчэ змог павесіць яго на сьпінку жалезнаногага крэсла. Сам пачаў расшпільваць кашулю, каб паказаць прабіты жывот. У прахалодным і паўцёмным пакоі панавала ціша і пах хлёркі. Хірург і астатнія дактары знаходзіліся ў аперацыйнай. Там спрабавалі ратаваць васьмігадовага малога, які выскачыў пад матацыкал з парку. Дзіцё прывезьлі ў бальніцу паўгадзіны таму. Пакуль высілкі дактароў былі беспасьпяховымі. Сярожкава сэрца запрацавала, але ў сьвядомасьць ён пакуль не прыходзіў...

Крэсла павалілася і загрымела. У пакой убегла Тамара і войкнула. На падлозе ляжаў перапэцканы крывёй паўраспрануты хлопец.

Прайшло тры дні.

Фэд стаяў на балконе і паліў. Расьціснуў недапалак падэшвай пан-

тофля. Абапёрся на парэнчыну і пачаў адціскацца. Ён не лічыў. Адціскаўся і глядзеў у двор. Хутка павінны былі вынесьці з пад'езду труну. Людзі пры ўваходзе зрушыліся, адсунуліся, натоўп сьціснуўся, як пальцы сьціскаюцца ў кулак. Духавы аркестр выпрастаўся, узьняў начышчаныя інструменты. Глуха бухнуў барабан, уздыхнулі трубы. Загаласілі жанчыны, а Фэд працягваў адціскацца. Па сьпіне пабег тонкі, як нітка, і халодны, як шкло, струменьчык поту. Выплыла нязвыкла кароценькая труна. Фэд спрабаваў разгледзець бела-ружовы твар Сярожкі. Глядзеў і не пазнаваў. Сярожка, колькі яго памятаў Фэд, заўсёды бегаў непрычасаным. Тут жа, валасы прыціскаліся да ілба, як прыклееныя. Фэдаў сябар – Мішка стаяў пад акацыяй і плакаў. Галаву не ўздымаў, каб Фэд з балкона ня ўбачыў. А Фэду плакаць і не хацелася. Ён адціскаўся і адціскаўся.

Прайшло сорак дзён.

Тамара сядзела ў прыёмным пакоі бальніцы і слухала радыё. Перадавалі канцэрт па заяўках. Яна ведала, што праз паўгадзіны Віктар зойдзе па яе, і яны пойдуць дамоў. Калі ж яна сыйдзе ў дэкрэт, то яны зьедуць з Гэ Пэ. Высьветлілі ж – яе Віктар у той аварыі – ні пры чым. Малы сам кінуўся пад колы. А пакуль можна ні пра што асабліва і ня думаць, ціхенька падпяваць і грызьці кіслы яблык.

З гэтага моманту пачынаецца іншая гісторыя.

Хлопцаў на школьнай пляцоўцы было двое – Фэд і Алік. У паўзмроку жаўцела аднапавярховая школа. Фэд паставіў нагу на жалезную парэнчыну зламанай лавы і ўзяўся перабэрсваць чаравікі. Ён рабіў гэта нясьпешна, але і неяк нярвова. У бок Аліка стараўся не глядзець. Той стаяў і трымаў рукі ў кішэнях.

Фэд выпрастаўся, абцягнуў крыху закароткую майстарку, зірнуў на гадзіньнік.

“А ты зможаш? А то, я і адзін спраўлюся”, – сказаў і спрытна накаціў на нагу чырвоны гумавы мячык. Пару разоў падкінуў з калена на калена і пасануў Аліку. Той спыніў мячык адным рухам. Прыціснуў, каб не скакаў. “Пайшлі... Ён хутка будзе. Каля прыпынку і пяроймем гада.” – Упэўнена прамовіў Алік і падкінуў на далоні нож.

*Менск. Сьнежань 2006 год.*

## МЯСАРЭЗКА

За тыдзень да дня свайго нараджэньня Валерка двойчы схадзіў у галантэрэйную краму. Адзін раз з маці, а потым, праз дзень, з бацькам.

Цяпер, пятнаццацігадовы падлетак стаяў перад люстэркам у перадпакоі і металічным грабеньчыкам спрабаваў прычасаць упартыя валасы. Рукавы кашулі былі падкасаныя. На правай руцэ пабліскваў то шкельцам, то металічным корпусам, навюткі гадзіньнік. Бацька падышоў і стаў побач. Яны былі амаль аднога росту. Толькі бацька крыху шырэйшы ў плячах. Бацькавы валасы – цямнейшыя і мяккія. Яны паслухмяна кладліся, як пажадаеш. Бацька зашпільваў гузікі і глядзеў на адлюстраваньне сына. Валерку падабалася клятчастая кашуля на бацькавых плячах.

Бацька штурхнуў сына і ўсьміхнуўся. Пакратаў шчаку і сьвежапаголенае падбароддзе. Узяў пляскатую бутэлечку з адэкалонам, пліхнуў сабе на далонь, расьцёр твар. Паляпаў далоньню па шчаках. Лінуў кроплю на валеркавы валасы. Усё адбывалася бяз словаў. Кожны рух быў звыклым і адпрацаваным. У перадпакой, па дарозе ў кухню, зазірнула маці. Яе ўсьмешка ў люстэрку падалася сыну крыху разгубленай. Адлюстраваньне ў квяцістым халаце высьлізнула за плоскасьць шкла. Клятчастую кашулю маці з сынам купілі бацьку разам, на Каляды. Валерка каторы раз зірнуў на свой гадзіньнік. Ён яшчэ не прывык да падарунка. Толькі паўгадзіны і насіў на руцэ. Бацька з сынам па-змоўніцку пераглянуліся..

– Я праз гадзінку вярнуся. Ну можа крыху і затрымаюся... у гараж яшчэ забягу, – сказаў мужчына жонцы ў кухню. – Падабаецца падарунак? Маўчыш... Бачу, падабаецца.

– Навошта? Позна, – як сама сабе з кухні сказала маці.

Грукнулі калідорныя дзьверы.

Валерка зайшоў на кухню. Сеў да стала і дапіў кампот. Паглядзеў, як нож разразае на кавалкі мяса. Маці папрасіла скласьці і прымацаваць да стала мясарэзку, а сама памыла нож і ўзялася лупіць цыбулю.

У глыбокай белай місе рабілася большай і большай ружовая гурба перакручанага мяса. Валерка падняўся і пайшоў. Яму не падабалася глядзець, як мяса ператвараецца ў фарш. Апошнія дні падлетка займала толькі адна думка.

Адна справа скончыць восем класаў, а зусім іншая стаць дарослым.

Цень ад каштанаў быў густы, цёмны, амаль чорны. Бялелі на дрэвах конусы кветак. Пахла бензінам і скошанай на газонах падвялай травой, нагрэтым за доўгі дзень пыльным асфальтам, дымам танных цыгарэтаў і такога ж таннага адэкалону. Так пахне самы пачатак правінцыйнага гэпэшнага лета.

Сяргей з Валеркам стаялі пад вялікім каштанам і глядзелі на вокны Палаца культуры. Там, за вялікімі вокнамі, у зале – танцы.

Хлопцаў было амаль не відаць – такім шчыльным быў цень. Калі ўспыхвала запалка – сьвятло выхоплівала засяроджаныя твары. Потым у цемры гарэла пара ружовых кропак, і чулася ціхая размова. Ім было па пятнаццаць гадоў, і яны адчувалі сябе дарослымі. Палілі бацькоўскія цыгарэты.

– Што, твае зноў сварацца? – спытаў Сяргей.

– Ды, ну іх... Было б чаго, – адказаў Валерка.

Сяргей кінуў пад ногі недапалак і расьціснуў яго гумавай падэшвай кітайскага паўкеда. Сяргей паліў хутка, бо не ўзацяжку. Набіраў поўны рот дыму і выпускаў праз нос. Валерка ж стараўся паліць па-дарасламу.

– І што мне ёй сказаць? – прамовіў Валерка. – Што, вось так адразу. Пайшлі да школы, я хачу?

– А ты хіба ня хочаш... Можаш і не адразу.

– А калі яна і слухаць не захоча?

– Захоча. Мяне ж паслухала... Яна ўсіх, хто за грошы, слухае... А мне па-суседску.

– Гэта цябе паслухала, бо яна – твая суседка... Табе спадабалася?

– І табе спадабаецца. Вунь яна ідзе. Я звальваю, каб не замінаць. Потым раскажаш, заўтра.

Сяргей зрабіў пару хуткіх нячутных грокаў і распусьціўся ў цемры, як цукар у кампоце.

Верка была тоўстая і непрыгожая. Перавальвалася з нагі на нагу, як качка. Яе лічылі дурніцай. Верка працавала на чыгунцы правадніцай. Ёй ішоў дваццаць чацьвёрты год, а замуж яе ня бралі. І не таму, што непрыгожая.

Валерка адштурхнуўся сьпінай ад камля каштана і заступіў дарогу. Верка спынілася і крыху насьцярожана войкнула. Яна нечакала, што некага сустрэне.

– Прывітаньне, Верка, – занадта нахабна сказаў Валерка і нечакана захлынуўся слінай, а ў роце зрабілася суха. – Патанцаваць сабралася?

– Добры вечар, адыдзі. Я сьпяшаюся.

– Слухай, Вера... У мяне грошы ёсьць... Пайшлі да школы...

– Ідзі ты... спаць... Колькі?

Валерка мітусьліва падаў пакамечаныя рублі.

– А колькі зараз?

– Чвэрць на адзінаццатую. – Не бяз гонару паведаміў Валерка і шпурнуў запалку ў цемру...

Верка ня доўга разглядала вільготныя грошы, а потым спрытна, пабабску, схавала іх пад станік.

Верка ішла паперадзе, а хлопец за ёй. Ён глядзеў на яе сьпіну, на карак, на чорную спадніцу, на белыя басаножкі... На вушах пахістваліся завушніцы. Верка цяжка дыхала, але не таму што хвалявалася, ці сьпяшалася... А Валерка цяжка дыхаў, бо хваляваўся. Яны дайшлі ціхім завулкам да школы. Да самага ганку. Тут было цёмна-цёмна. Людзі гэтым завулкам хадзілі рэдка, а па цёмным амаль ніколі. Гэта быў стары, паўразбураны школьны ганак з пукатымі вазонамі, з якіх пасмамі зьвісала пасохлая трава. Дзьверы школы, якія выходзілі на ганак не адчыняліся можа сто гадоў. На прыступках ганку расла трава. Пахла сьмецьцем, тынкоўкай і кветкамі са школьнага саду.

Верка спынілася. Павярнулася да хлопца і паспрабавала прыязна ўсьміхнуцца. У Валеркі ўсьміхнуцца ў адказ не атрымалася. Жанчына паклікала падлетка бліжэй. Валерка бачыў у цемры яе белыя далоні з кароткімі пальцамі.

– Ну што стаіш, расшпільвайся хутчэй, кавалер... – сказала Верка і ўзялася задзіраць чорную спадніцу.

Валерка нярвова, а таму мітусьліва, корпаўся з шырокай партупеяй, якая раптам не хацела расшпільвацца.

Усё адбылося хутка.

Вельмі хутка...

– Правесьці цябе, Вера? – прапанаваў Валерка.

Верка параторгнула плячамі, паправіла станік, абцягнула вузкую спадніцу, а потым выцерла травой правую нагу, над круглым каленам. Падлетак чакаў.

– Ідзі ты, Валерка, лепш дамоў, чуеш? – раптам прамовіла і ўзялася прыгладжваць валасы. Крыху пастаяла, падумала, як нешта сказаць хацела, і нетаропка пайшла.

Валерка сеў на ганак і пстрыкнуў запалку. На гадзіньніку стрэлкі зьнерухомелі на адзінаццатай гадзіне. Секундная хуценька бегла па коле.

Сэрца не калацілася. Ён быў такі спакойны, такі спакойны, што і сам дзівіўся. Сьвет, дрэвы, неба – не зьмяніліся. Усё засталося на сваіх ранейшых месцах. Ён чуў цяжкія крокі Веркі. Захрумсьцелі шыфер, шкло... Крокі зрабіліся нячутнымі. Валерка падняўся, паправіў на запясьці новы гадзіньнік. Так робяць мужчыны. Побач з кедам ляжалі скамечаныя грошы. Валерка нахіліўся і падняў. Паперкі пахлі потам і пудрай. Гэтая акалічнасьць яго разьвесяліла.

Падлетак хутка ішоў завулкам, побач з доўгай цаглянай сьцяной гаражоў. Ён думаў пра тое, як заўтра сустрэне Сяргея і пахваліцца. Скажа коратка, як між іншым, і паглядзіць на новы гадзіньнік. Гэта будзе заўтра, а цяпер трэба вярнуць грошы... Дагоніць Верку, аддасьць, а потым прыйдзе дамоў і памыецца.

Ён пачуў у цемры, пад старымі каштанамі, яе сьцішаны сьмех. Потым пачуў яе крык. Кароткі, як перадсьмяротны. Падлетак аж пахаладзеў. За крыкам стогн. А потым сьмех і бацькаў голас.

Ён увайшоў на кухню. На патэльні шкварчэлі катлеты. Бацька сядзеў за сталом і еў. Ён глянуў на сына. Валерка сеў насупраць, а потым падняўся. Ён зьняў з рукі новы гадзіньнік. Апусьціў яго ў мясарэзку, якая яшчэ была прымацаваная да стала, і пачаў круціць ручку. Захрубасьцела раструшчанае шкло, заскрыгатаў метал. Мясарэзка адарвалася ад стала і з грукатам абрынулася на падлогу.

Валерка разьвярнуўся, выскачыў з кухні, зайшоў у ванны пакой і, як быў у вопратцы, стаў пад гарачы душ. Стаяў пад пругкімі струменямі гарачай вады і цяжка дыхаў. Яго калаціла. Ён прысеў на кукішкі, скурчыўся. Камяк падняўся да горла...

Дзьверы пару разоў таргануліся і адчыніліся. Бацькі глядзелі на сына. Валерка сядзеў на кафлянай падлозе. Закрываў твар рукамі.

Ён думаў... Ён ня думаў... Яму хацелася зрабіцца маленькім-маленькім.

*Красавік-травень 2007*

## ЧОРНЫ КАНДУІТ

*А.Г.*

1.... нажніцы медыцынскія, вялікія. Яны ляжалі ў скрыні пісьмовага стала (зьнікненьне заўважыў пятага кастрычніка 1996 году). Выпадкова набыў іх у Пятроўскага – сусед па гаражы, восеньню 1990 году, яму не хапала на бутэльку. Ад таго таннага віна разбалелася галава. Потым зрабілася кепска, а ноччу давялося двойчы прамыць страўнік. Яна кажа, што ня бачыла іх ужо даўно. Цікава. Нажніцы я нікому не даваў, з кватэры не выносіў. Ну, і дзе яны?

2.... партманэтка скураная, новая, запакаваная ў кардонку, падарунак на шасьцідзесяцігоддзе. Зьнікла з шафы з добрай вопраткай, якая стаіць у яе пакоі. Ляжала на верхняй паліцы, побач з шэрым чэшскім капялюшом. У кардонцы з фотаздымкамі з пахаваньня Андрэя... Яна кажа, што я зьбіраўся з партманэткай ісьці на дзень нараджэньня, пакласьці туды яшчэ дваццаць даляраў і падараваць Самсону. Па-першае, у Самсона даўно няма машыны. А там сьпецыяльная кішэнька празрыстая пад да-

кументы. Па-другое, няма ў Самсона столькі грошай, каб хадзіць па хлеб з кефірам з такой шыкоўнай партманэткай. Гэта яна – некаму са сваіх знаёмых занесла. Думала, што я не заўважу. Сказаў, тое што думаў – тры дні не размаўляла і да стала ня клікала. (Знайшлася 12 лістапада 1996 году, калі зьбіраўся да Самсона ў бальніцу). Ляжала ў кішэні шэрага драпавага паліто, гузік быў зашпілены, а драп тоўсты, дзе там адразу намацаеш. Давялося сказаць пра знаходку, прасіць прабачэньня. Не зьдзівілася. А партманэтка не турэцкая, як я лічыў, а італьянская...

3.... інструкцыя да мікрахвалёўкі. Каму яна трэба, калі ў Менску перакладчыка з японскай не знайсьці.

4.... рамка памерам 32 на 44 см. (самаробная, дубовая... зьнікла невядома калі). Хапіўся ўчора – 5 сакавіка 1997, пад вечар. Думаў, што на антрэсолі паклаў. Давялося лезьці пад самую столь. Перабраў, перагледзеў усё – рамкі няма. Знайшоў рукавіцы-крагі і матацыклетныя акуляры, якія лічыў згубленымі. Вось толькі рамкі той дубовай няма. Абышоў усе чатыры пакоі, ванную, прыбіральню, калідор. Нават на шафах пагглядзеў. Хацеў уставіць партрэт Лінды, той самы – дзе яна сядзіць на падваконьні у новым ашыйніку, глядзіць на мяне ўважліва, па-чалавечы.

5.... сьвярдзёлак, фрэза (заводская) 30 сакавіка.

6.... акуляры яе – старыя. Зьніклі 1 красавіка гэтага году. Ёсьць футарал, а акуляраў няма. Няхай сама шукае. Мне ж яны без патрэбы. Паглядзеў за ложкам у яе пакоі – яны аказаліся там, разам з часопісам, так я і ведаў. Матлянула рукой ноччу – яны і зьляцелі.

7.... попельніца крыштальная. 20 красавіка. Стаяла на паліцы ў маленькім пакоі. Калі сыходзіў з працы, прыхапіў яе. Ня мог ня ўзяць – дваццаць восем гадоў пераходзіла разам са мной з кабінету ў кабінет. Каму яна магла спатрэбіцца. Можа сантэхнікі? Яны ж дзьве гадзіны круцілі яшчэ новы радыятар, прадзімалі... Паскуды. Нічога рабіць ня ўмеюць. Я ж ім бутэльку гарэлкі даў і закуску. Яны – больш няма каму.

8.... тэлефонны даведнік з працы. Акрамя мяне нікому ён ня трэба. Даведнік стары, але тэлефонныя нумары новыя.

9.... брусок з карэльскай бярозы. Не знайшоў. А ведаю, што ён стаяў у прыбіральні. З яго планаваў зрабіць падсьвечнік і падараваць стаматолагу Ч. Давядзецца тачыць з грушы... Знайшоў, дзякуй Богу, падклала пад скрыню з абуткам у передпакоі, каб тая не хісталася. Дадумалася.. Кажа, што я сам і падставіў. Думае, што я бярозу ад сасны не адрозьню...

10.... нататнік маленькі ў скураной вокладцы. Зьнік 12 траўня 1997 году. Там тэлефоны дактароў; акулістаў, тэрапеўтаў і стаматолагаў... Каб не каронка, пад якой разбалеўся зуб, то і не хапіўся б таго нататнічка. Ёсьць там яшчэ некалькі патрэбных нумароў... А можа, яна перахавала? Знайшоў попельніцу – была пад ваннай, а у ёй – недапалак.

11.... даведка з падатковай інсьпекцыі. Зьнікла 29 траўня 1997 году.

12.... порах, пяць патронаў да карабіна. Нашто пакідаў? Цяпер шукай – хвалюйся, думай.

13.... атлас аўтамабільных дарог СССР з уласнаручнымі запісамі, заўвагамі. Зьнік 19 чэрвеня ў 1997 годзе. Абшукаў кніжныя шафы ва ўсіх пакоях. Перабраў дзьве тысячы кніжак. Перапароў падшыўкі газетаў і часопісаў... Схадзіў у гараж, агледзеў паліцы і скрыні. Няма. А я па ім столькі аб'ехаў. Цяпер такіх не выдаюць. Хер з ім. Пазваніў Мікалаю П. Кажа, што атлас мой памятае. Але ня браў, бо ёсьць тры сваіх. Да і куды па ім цяпер езьдзіць? Каб даехаць да Крыжоўкі, атлас ня трэба. Прапанаваў свае, з трох – на выбар. Хоча каб я да яго зайшоў, бутэльку прынёс. Нашто мне чужыя, калі свой ёсьць? Можа ён у жалезнай скрыні?

14.... ключ ад жалезнай скрыні. Самаробны. 27 верасьня 1997 году шукаў атлас. Падумаў, што ён можа ляжаць у скрыні, яна ж парожняя. Яна сказала, ключа таго ня бачыла, але памятае, што раней ён вісеў на цьвічку ў малым пакоі. На цьвічку, між іншым, паглядзеў адразу. Перабраў усе запасныя ключы ў шуфлядах пісьмовага стала, на кухні і ў скрыні пад ваннай – ні адзін не падыходзіць... Давядзецца зламаць замок. У скрыні атласа не было.

15.... штаны вельветавыя. 2 кастрычніка 1998 году. Сабраліся ісьці на базар па памідоры. Вырашыў надзець вельветавыя штаны. Шукаў па ўсіх шафах, паглядзеў у ваннай, нават у калідоры на вешаку. На базар не пайшоў, памідораў не купіў – шукаў і злаваўся на сябе, а больш на яе. Разумею, што ёй яны ня трэба. Але, упэўнены, гэта яна іх некуды запхала, а цяпер і сама ня памятае куды, прызнацца ж сорамна... Можа ў гаражы? Заўтра пагляджу. Абавязкова.

16.... шалік шэры. Утульны, махеравы. Хапіўся 3 лістапада гэтага году. Спадзяваўся, што ў рукаво запхаў. Перабраў курткі і паліто – няма. Крыўдна – такі цёплы і прыгожы. Можа на пахаваньні Т.К. забыўся. Патэлефанаваў яго дачцэ. Насварылася, што на саракавіны не прыйшоў... А мне тыя саракавіны, каб шалік быў, то можна было б і на могілкі пад'ехаць...

17.... брошка з бурштынам. Зьнікла невядома калі. Памятаю, што каштавала 36 рублёў. Купілі ў 1972 годзе, у Вільні, у маленькім мастацкім салоне, побач з плошчай. Ёй брошку, а мне пальчаткі. Рудыя і цеснаватыя. Быццам бяз брошкі той і немагчыма да сястры схадзіць. Маўчыць, а я тут пры чым. Перагледзелі ўсё. Думаю – ня знойдзем ніколі...

18.... пальчатка скураная на правую руку. Я ёй тлумачу, што калі б нехта скраў, то не адну пальчатку, а пару. Каму адна пальчатка патрэбная. Знаёмых інвалідаў у нас няма. Здаецца, пераканаў. Прапанаваў пашукаць па кішэнях цёплай вопраткі. Не знайшла, а таму злосная. Можа цяпер мяне зразумее, калі я нешта шукаю і не знаходжу. Не, не зразумее.

19.... касета 23, які ж на ёй фільм?

20.... часопіс “Кодры” (адзінаццаты нумар за 1989 год). Цікава. Каму ж я яго мог даць. Трэба паглядзець у іншых нумарах, што друкавалася ў адзінаццатым і па зьмесьце вылічыць.

21.... самапіска “PARKER”

22.... самапіска “Ленінград” – зялёная, са срэбным каўпачком.

23.... кніжка “Выбранае” М. Зошчанка. 1962 году.

24.... кніжка “Рабінзон Круза” 46 году выданьня.

25.... замок гаражны, вялікі, самаробны. (хацеў прадаць Пятроўскаму).

26.... брэзент. Кавалак ладны. Ляжаў у канапе, пад цэлафанам.

27.... нажоўка новая.”SANDVIK”

28.... лупа ў латуннай рамцы. Нямецкая. З драўлянай ручкай. Здаецца, учора ляжала на стале ў зале, а можа на падваконьні... Зьнікла. Хацеў прачытаць інструкцыю да таблетак, праз акуляры ня бачу. Паперу эканомяць, дурні... Яна ня бачыла. Добра, што хоць інструкцыю прачытала.

29.... пасьведчаньне з працы. (Чырвонае). Шукаю, а навошта яно мне?

30.... капэрта з фотаздымкамі каляровымі і ч.б. з пахаваньня сына. Капэрта сіняя. Заклееная. Падпісаная. Шукаў 2-3 студзеня 2004 году. Ляжала ў вялікай кніжнай шафе, на верхняй паліцы.

31 …. Касета 23. “Золата Макены”.

32… фотаздымак сківіцаў. Ну, а ён каму трэба?

33... акуляры новыя.

34... 118...

(Сідарук Яўген Мікалаевіч 1933 году нараджэньня. На выгляд семдзясят – семдзясят пяць. Пайшоў з дому 8 студзеня гэтага году і зьнік. Апрануты быў у шэрае паліто, зімовую шапку, шэрыя вельветавыя штаны, чорныя зімовыя чаравікі. Пад левым вокам маленькі шнар. Калі хто бачыў, то, калі ласка, патэлефануйце...). Аб’ява з газеты “Вячэрні Мінск” ад 10 студзеня 2005 году, прыклееная ў чорны кандуіт пад нумарам 122.

*P.S.* Калі я напісаў гэтую гісторыю, то мае знаёмыя, яшчэ былі жывыя. Зьбіраліся пераклейваць шпалеры і фарбаваць падлогу. Рабілі ў тоўстым сшытку запісы пра рэчы, якія згубіліся. Сварыліся ў сваёй вя-

лізнай кватэры, запоўненай розным барахлом. Я не захацеў друкаваць гэты тэкст, бо навошта крыўдзіць старых людзей. Першай памерла яго жонка. Раптоўна. У гаспадара пачалася дэпрэсія.

Ён застаўся адзін, і жыцьцё страціла сэнс. Калі адчынілі кватэру, то ў вялікім пакоі знайшлі чатыры падрабязныя лісты. Сваякам жонкі, школьнаму сябру, суседзям, якія дапамаглі з пахаваньнем жонкі... Чацьвёрты ліст у пракуратуру. У ім ён патлумачыў прычыны, па якіх не жадае далей жыць. Мой добры знаёмы скончыў жыцьцё самагубствам.

*Менск 12.03.06. – травень 2007 год.*

## ПАРТА

Сьнег павольна падаў.
Буйнымі і цяжкімі сьняжынкамі.

Раптоўнаму сьнегу радаваліся толькі дзеці, якія сьпяшаліся ў школу.

Саракагадовы бомж – па мянушцы Камар, нечаканаму сьнегу ня толькі не зьдзіўляўся, але і не заўважаў яго. Камара моцна смажыла і круціла. Яму было кепска. Так пагана бывае чалавеку толькі нараніцу. Але гэтак жа яму было і ўчора, і заўчора, і шмат дзён.

Ён пахадзіў пад крамай, якая яшчэ і ня думала адчыняцца. Потым дварамі дайшоў да прыёмнага пункту шклатары. На жалезных дзьвярах вісеў добра знаёмы, а таму ненавісны, замок, а на сьнезе былі толькі сабачыя ды птушыныя сьляды.

Сьнег павольна падаў.
Буйнымі і цяжкімі сьняжынкамі.

Камар ізноў даваloкся да крамы. Сёньняшні дзень быў не яго...

Але бомж пра гэта стараўся ня думаць. Падобныя непатрэбныя развагі яго не займалі. Ды і хто стане напружвацца і філасофстваваць, калі гарыць шлуньне, калі засьмяглы рот прагне таннага віна, якое і пітво і наедак адначасова. Камар чорнай далоньню грабануў сьнегу. Адкусіў ад яго, як ад белага хлеба, выцер даўно няголенае падбароддзе і пайшоў... Не бязмэтна, а накіравана, хутка так. Дзіўна, паліць не хацелася зусім. У кішэні ляжаў пакамечаны пачак танных цыгарэтаў і ружовая запальнічка. Нікога са знаёмых пакуль ня трапілася. Камар сьпісваў нешанцаваньне на холад і раптоўны сьнег.

Міліцыянтаў бомж заўважыў першым. Яны ішлі па вуліцы і гаманілі. Сытыя, цёпла апранутыя, упэўненыя. Камар прыціснуўся да сьцяны, а потым схаваўся за рог дома. З ахоўнікамі парадку сустракацца не хацелася, і не таму, што маглі пабіць, затрымаць і пачаць разьбірацца. Камар не любіў, хоць час ад часу і даводзілася расказваць сваю біяграфію.

Ён перайшоў вуліцу. Міліцыянты яго заўважылі, але сьледам не падаліся.

Бомж павярнуў да дзіцячага парку. Раньне. Бязьлюддзе і цішыня. У парку нікога такім надвор’ем не спаткаеш, нічым не разжывешся. Спартоўцы, сабачнікі, дзеці з яркімі заплечнікамі. На мосьціку праз Сьвіслач

Камар убачыў мужчыну. Той стаяў і крышыў батон. Карміў качак. Вада ў рацэ чарнела і хвалявалася бясконца. На хісткую паверхню падалі сьняжынкі і раставалі, прападалі. Сьнег бялеў на траве, сівеў на кустах, а на асфальце раставаў. Парапет і сьцежкі былі мокра-чорнымі.

Мужчына быў у цёплай з капюшонам марынарцы. Разам з качкамі харчаваліся крышаным батонам і белакрылыя крыклівыя чайкі. Яны выхоплівалі разьмяклы хлеб. Але мужчына карміў птушак механічна. Ён, як падалося Камару, нават увагі на іх не зьвяртаў.

Камар прыгледзеўся і пайшоў хутчэй. Ён папраўляў шапку і зашпільваў гузікі. Ён яшчэ ня быў канчанай бруднай істотай. Пакуль яшчэ меліся некаторыя праявы цывільнасьці ў яго зашмальцаваным абліччы. Нават пальчаткі не палохалі дзіркамі-ранамі, а шапка з пумпонам выглядала, рыхтык новая... Камар адчуў, што ўдача павярнулася да яго тварам, і гэты дзень, нарэшце, складзецца...

Бомж падышоў і стаў побач з дагледжаным мужчынам. Выцягнуў, можа й крыху мітусьліва, з пачка цыгарэту і запаліў.

– Прывітаньне, Толік! – голас бамжа прагучаў бадзёра.

Мужчына павярнуўся на голас, зірнуў на суразмоўцу, хітнуў. Заняўся ранейшай справай, пачаў дужымі пальцамі крышыць батон.

– Ты што, не пазнаеш? Я – Віцька, Віцёк Камароўскі.

– Віцёк? – прамовіў мужчына і агледзеў бамжа з ног да галавы, як жанчыну. – Зашпіліся, на ўсе гузікі.

– Мы з табой... – крыкнуў узрадавана бомж. – За адной партай, бляха, тры гады сядзелі. Школа нумар сорак два. Дзясяты “А”.

Але гузікі бомж усё ж паспрабаваў зашпіліць. Гузіка пад каўняром не аказалася. Адно брудны бясколерны шалік паправіў.

– Віцёк... Віцёк... – зьдзекліва-аднастайна мармытаў мужчына.

Высокая жанчына зьявілася нечакана. Яна была ў шэрым каракулевым футры, на якім сьнег не раставаў, як і на траве. У руцэ трымала стракатую торбу з ежай. Яна зірнула на бамжа, як па твары ляснула – наводмаш.

Падаў сьнег і раставаў на чыгуннай агароджы.

– Адвалі! Што трэба? – звонкі жаночы голас гучаў загадна.

– Толік, Анатоль, яна што твая жонка? – глянуў перш на мужчынуаднакласьніка, потым на высокую жанчыну бомж. – Мне, Толік, на бутэльку віна. Усяго толькі. Чуеш. Я аддам. Мы ж з табой за адной...

Жанчына зыркнула на разгубленага бамжа, зірнула па баках, як шукала дапамогу. Потым схапіла мужчыну пад локаць і скранула з месца.

Мужчына зрушыўся. Ён няўпэўнена, па-дзіцячы, перастаўляў ногі, а крокі атрымліваліся дробненькія.

– Ты... казёл... казёл... – пакрыўджана, шэптам абураўся бомж. – Я да цябе, як да сябра, як да чалавека, а ты...

Высокая жанчына ў шэрым футры азірнулася. Твар у яе выглядаў стомленым, спакутаваным.

Круціліся чайкі. Нярвова крычалі.

Сьнег павольна падаў.
Буйнымі і цяжкімі сьняжынкамі.

– У нас ёсьць парта? – раптам спытаў мужчына.

– Якая парта, Анатоль?

– Парта... Парта... Парта... Зашпіліся... Вецер...

Бомж скрушна глядзеў усьлед свайму аднакласьніку і разумеў, што ўдача ізноў ад яго адвярнулася.

Мужчына раптам спыніўся. Азірнуўся. Жанчына тарганула яго за руку.

– Спачатку пасьнедаеш, а потым лекі і мыцца. Сёньня нам да доктара. – Голас яе гэтым разам гучаў хоць і заклапочана, але будзённа.

Мужчына звузіў вочы і зрабіў пару шырокіх упэўненых крокаў.

“Пазнаў я цябе Віцька, хоць ты і мала на сябе падобны... Амнезія, Віця, лепш чым турма...”

– Ты нешта сказаў? – жанчына глянула на мужа.

– Парта мая дзе?.. – мужчына тарганууся, як ня ўпаў.

Сьнег павольна падаў.

Буйнымі і цяжкімі сьняжынкамі.

*Менск. Красавік. 2007.*